ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
12
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 13 (1426)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

## ПАМЕРАЦЦА СІЛАМІ

вырашылі камсамольскія актывісты на спартакіядзе паміж камітэтамі камсамола факультэтаў, якая праводзіцца па ініцыятыве камітэта камсамола універсітэта. У праграме — спаборніцтвы па бегу на 100 метраў, крос, плаванне, стральба, падцягванне, валейбол.

Высокія вынікі ў спаборніцтвах па падцягванню паказаў Ц. Шваркоў (факультэт радыёфізікі і электронікі), а лепшай сярод дзяўчат была член камітэта камсамола хімфака Карончык. У бегу на 100 метраў перамаглі Ф. Палякшанаў (мехмат) і С. Наўра (біяфак).

Пасля двух відаў праграмы лідзіруюць камітэты камсамола факультэтаў радыёфізікі і электронікі і механіка-матэматычнага факультэта, а на трэцім месцы — камітэт камсамола хімфака. Камітэт камсамола універсітэта — на пятым месцы.

Не прыняла ўдзелу ў спартакіядзе каманда камітэта камсамола журфака.

А. МАЛЯРЭВІЧ,
член камітэта камсамола універсітэта.

## НАРАДА-СЕМІНАР

дэканаў факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі пачне сваю работу 17 красавіка ў актавай зале галоўнага корпуса Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Мэта яе — далейшае ўдасканаленне вучэбна-метадычнай, навуковай і выхаваўчай работы на факультэтах ВНУ. У рабоце нарады прымуць удзел работнікі апарату МінВНУ СССР і БССР, Дзяржплана БССР, Дзяржаўнага камітэта па працы БССР, Мінскай ВПШ пры ЦК КПБ.

На пасяджэннях чатырох секцый (універсітэты, педагагічныя ВНУ, ВНУ мастацтва і культуры; тэхнічныя, тэхналагічныя і эканамічныя ВНУ; медыцынскія і сельскагаспадарчыя ВНУ, Беларускі інстытут фізічнай культуры; завочныя і вячэрнія факультэты) будуць разгледжаны пытанні ўдасканалення вучэбнага працэсу, камуністычнага выхавання, падбору, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і расстаноўкі навукова-педагагічных кадраў, арганізацыі грамадскага харчавання і медыцынскага абслугоўвання, арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў і г. д.

У праграме нарады — экскурсіі па гораду, на Курган Славы, у Хатынь, лекцыі, выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці.

26 красавіка нарада-семінар закончыць сваю работу.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

## ● ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА ●



Фота Т. Траццяк, студэнткі факультэта журналістыкі.

— ШТАБ працоўных спраў? Мне начальніка. Вось склалі спісы атрадаў. Праверце, калі ласка.

— Надзя! Надзейка, калі ў нас пасяджэнне? У аўторак? Ну добра, я буду.

— Скажыце, калі ласка, вы — Надзея Астапчук? Ды я тут, уласна кажучы, па асабістаму: не маглі б вы дапамагчы мне...

У штаб працоўных спраў Надзея, як сама прызналася, трапіла выпадкова. «Зацягнула» ў камітэт камсамола сяброўка — Валя Шэвель. «Ты не ўяўляеш сабе, як там цікава!» — гаварыла яна. З гэтым Надзея і не спрачалася. Але калі паўстаў выбар: начальнік штаба працоўных спраў ці загадчыца сектара ўліку, дзяўчына нават крыху разгубілася. Пераважыў усё ж штаб працоўных спраў. Ведала, будзе цяжка, ведала і другое — тут яна можа зрабіць больш карыснага. Пачынаць прыйшлося з ліквідацыі «хвастоў» папярэдніка, але Надзея за даручаную справу ўзялася з агеньчыкам, з натхненнем. Фарміраванне студэнцкіх будаўнічых, сельскагаспадарчых атрадаў, арганізацыя суботнікаў, пасяджэнні, справаздачы... Часта вярталася ў свой пакой з адным жаданнем: нікога не чуць і не бачыць. Але на наступны дзень выходзіла з інтэрната, і... ногі самі неслі яе ў камітэт камсамола. А як жа інакш, калі там яшчэ заставаліся нявырашаныя пытанні, справы, якія трэба было зрабіць...

Т. ГРЫДЗЮШКА.

## ● СТУДЭНТ: ПОГЛЯД З КАФЕДРЫ ●

# «ДРЭВА РАСЦЕ ТЫМ ВЫШЭЙ, ЧЫМ БОЛЬШУЮ ПРАСТОРУ АХОПЛІВАЕ ЯНО КАРЭННЯМІ»

**Знаёмыя фізікі, да якіх я звярнулася з пытаннем, аднадушна назвалі ў ліку самых паважаных і цікавых выкладчыкаў у сябе на фізічным факультэце дацэнта Германа Віктаравіча Шышкіна.**

**Кафедра тэарэтычнай фізікі, пагадзіцеся, зусім не месца для размовы аб нечым «ідэальным», няхай нават аб рэальна існуючым. І ўсё ж я вырашыла спытаць адразу:**

**— Герман Віктаравіч, існуе такое паняцце — «ідэальны студэнт». Як, на ваш погляд: ці мае права на жыццё гэты тэрмін?**

— Ідэальнымі я смела магу назваць крышталь, акружнасць, паверхню, карацей кажучы, дастаткова простыя з'явы. А студэнта лепш за ўсё назваць перспектыўным, здольным, працавітым, хоць, магчыма, увесь гэты комплекс якасцей і азначае ўмоўную «ідэальнасць».

З пункту гледжання адукаванасці такі студэнт павінен заўсёды памятаць, што «лішніх» ведаў проста не існуе. Не мае сэнсу падзяляць прадметы на патрэбныя і непатрэбныя, карысныя і бескарысныя для тваёй будучай дзейнасці. У будучым, перакананы, не раз зробяць табе паслугу веды, якія некалі былі «лішнімі». Колькі б чалавек ні ведаў — гэтага ўсё роўна мала. І зусім ужо не абысціся без самастойнай работы. Патрэбна трэніраваць свой мозг. Я заўсёды гавару студэнтам, што мозг патрабуе ўсё новых нагрузак. Як спартсмен без пастаянных трэніровак, так і мозг без пастаянных нагрузак ніколі не дасягне вышынь. Аднак калі спартыўную форму, некалі страчаную, можна аднавіць, то мозг, прывучаны да ляноты, ніколі не навучыцца працаваць з поўнай аддачай.

Вось, на мой погляд, пералік патрабаванняў да «ідэальнага» студэнта. Не абысціся і без пастаяннага пачуцця неспакою, незадаволенасці сабой.

**— Вы згодны, што сённяшняму студэнту вучыцца цяжэй, чым, напрыклад, 30 гадоў назад?**

— Не, з гэтым я не згодны. Падобныя выказванні выкліканы ў асноўным узрастаючым патокам інфармацыі. Але нельга забывацца і на тое, што метады пазнання таксама пастаянна ўдасканальваюцца.

Прывяду прыклад. У трыццатых гадах фізік-тэарэтык Волкаў даследаваў электроны ў полі плоскай электрамагнітнай хвалі. Даследаванне стала асновай доктарскай дысертацыі і заняло 200 старонак. Праз 50 гадоў новымі шляхамі была распрацавана гэтая ж тэма і ў кандыдацкай дысертацыі заняла ўсяго дзве старонкі!

Калі ж прыгадаць, як палепшыліся матэрыяльныя ўмовы жыцця і быту студэнтаў за апошнія 30 гадоў, то я схільны да адваротнага пункту гледжання. Сённяшняму студэнту вучыцца лягчэй, чым 30 гадоў назад. Не выпадкова за гэтыя гады «памаладзелі» сярэднестатыстычныя кандыдаты і дактары навук.

**— Як вы ставіцеся да слоў: «Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела»?**

— Само пытанне настройвае на адказ у такім жа духу. Як жа, хочацца спытаць, жыць у студэнцкія гады? Гэта гады аптымістычных надзей, калі ўсё ў тваіх руках, калі ўсё залежыць ад цябе. Здаў сесію на выдатна—і зноў, як у песні пяецца, «...на душе і привольно, и весело, и тревожно чуть-чуть»... Заўважце — трывожна. Трывожна таму, што студэнт, напэўна, памятае народную мудрасць: «Делу — время, потехе — час». Значыць, не забывае пра галоўнае.

**— І пастаянная праблема: чым лепш займацца ў вольны час?**

— Нешта пэўнае тут сказаць цяжка. Кожны займаецца тым, што яму больш падабаецца. Я падтрымліваю і турыстаў, і альпіністаў, і аматараў дыскатэкі (дыскатэка ў нейкай ступені — далучэнне да свету музыкі).

**— Калі ўжо размова зайшла аб захапленнях, адкрыю чытачам, што нядаўна прайшла выстаўка вашых работ, дзе былі прадстаўлены цікавыя вырабы і разьба па дрэву. Яшчэ я ведаю, што вы пішаце акварэллю, захапляецеся паэзіяй. Тое, што «фізікі» яшчэ і «лірыкі» — вядома.**

— «Дрэва расце тым вышэй, чым большую прастору ахоплівае яно карэннямі»,—прачытаў я недзе. Хаця агульная думка такая: «раскідвацца» — гэта дрэнна. Аднак у гісторыі ёсць мноства прыкладаў усебакова таленавітых і здольных людзей, якія дасягнулі самых вялікіх вышынь у многіх навуках. У якасці прыкладу магу прывесці працы М. Ламаносава і многіх нашых сучаснікаў. Я ўпэўнены: універсалізм не перашкаджае чалавеку быць прафесіяналам у лепшым сэнсе гэтага слова.

Што датычыць асабіста мяне, то цікавасць да жывапісу, графікі ўвайшла ў маё жыццё даўно і назаўсёды, так як і тэарэтычная фізіка. Лічу, што і мой галоўны «клопат» і захапленне дапамагаюць мне бачыць жыццё ва ўсім яго аб'ёме, знаходзіць агульную мову з людзьмі.

Ну, а маладому чалавеку, студэнту, я думаю, «раскідвацца» проста неабходна.

Гутарку вяла І. КЕЗІК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

# ЗАПРАШАЕ ЗАВОЧНЫ

**Завочная форма навучання ў агульнай сістэме падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй адыгрывае вялікую ролю.**

**Калі вы захацелі атрымаць вышэйшую адукацыю без адрыву ад асноўнай работы, мы запрашаем вас на завочную форму навучання ў БДУ імя У. І. Леніна — старэйшую навучальную ўстанову Беларусі, буйнейшы навучальны і навуковы цэнтр рэспублікі.**

**Завочная форма навучання — лепшая форма павышэння кваліфікацыі для тых, хто ўжо працуе па абранай спецыяльнасці, але не мае вышэйшай адукацыі.**

**У падрыхтоўцы спецыялістаў па завочнай форме навучання ў БДУ імя У. І. Леніна прымаюць удзел каля 70 універсітэцкіх кафедраў, дзякуючы чаму вучэбную работу забяспечвае высокакваліфікаваны прафесарска - выкладчыцкі калектыў, у саставе якога каля 30 дактароў навук, прафесараў і каля 300 кандыдатаў навук і дацэнтаў.**

**Вялікую дапамогу студэнтам-завочнікам у іх самастойнай рабоце аказваюць бібліятэка універсітэта і вучэбна-метадычны кабінет завочнага факультэта, якія забяспечваюць студэнтаў вучэбнымі праграмамі, метадычнымі дапаможнікамі, вучэбнай літаратурай. У міжсесійны перыяд праводзяцца дні завочніка, калектыўныя і індывідуальныя кансультацыі, а таксама іншыя віды вучэбнай работы.**

**Студэнты-завочнікі атрымліваюць тую ж спецыяльнасць, што і выпускнікі дзённай і вячэрняй форм навучання, і працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі і культуры нашай рэспублікі. Студэнты - завочнікі карыстаюцца льготамі, якія даюць ім правы на дадатковы аплачваемы водпуск тэрмінам на 30 дзён (I—II курсы) і 40 дзён (III—IV курсы) у перыяд лабараторна-экзаменацыйных сесій, якія праводзяцца два разы ў год.**

**Тыя, хто хоча атрымаць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці, змогуць выбраць сабе спецыяльнасць па густу на адным з аддзяленняў завочнага факультэта. Завочнае навучанне ва універсітэце вядзецца па спецыяльнасцях: філалогія, журналістыка, гісторыя, правазнаўства, геаграфія, біялогія.**

## ФІЛАЛОГІЯ

ХТО ЛЮБІЦЬ родную мову і літаратуру, хто жадае быць выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ці выкладчыкам рускай мовы і літаратуры, той запрашаецца на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры.

Адзін са старэйшых і буйнейшых ва універсітэце філалагічны факультэт мае багатыя і слаўныя традыцыі ў вучобе і выхаванні творчай моладзі. Яны звязаны з навукова-педагагічнай работай на факультэце вядомых вучоных і пісьменнікаў — народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа, акадэміка АН БССР І. І. Замоціна, прафесараў Е. І. Барычэўскага, А. Н. Вазнясенскага, М. Н. Піатуховіча, П. А. Бузука і іншых, якія шмат зрабілі для развіцця лінгвістычнай і літаратуразнаўчай навукі БССР, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для народнай адукацыі, навуковых і культурных устаноў рэспублікі. Гэтыя традыцыі захоўвае і памнажае прафесарска - выкладчыцкі калектыў факультэта, у саставе якога сёння налічваецца 125 чалавек, у тым ліку 11 прафесараў і дактароў навук, 79 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Сярод іх вядомыя пісьменнікі, паэты, крытыкі, члены Саюза пісьменнікаў СССР і БССР: прафесары Н. С. Гілевіч, А. А. Лойка, С. Х. Александровіч, П. І. Ткачоў, дацэнты Д. Я. Бугаёў, В. П. Рагойша, М. Б. Яфімава і іншыя.

Завочную форму навучання абслугоўвае 7 кафедраў: беларускай мовы (загадчык прафесар Л. М. Шакун), беларускай літаратуры (загадчык дацэнт В. В. Казлова), рускай мовы (загадчык прафесар П. П. Шуба), рускай класічнай літаратуры (загадчык прафесар П. І. Ткачоў), рускай савецкай літаратуры (загадчык прафесар І. П. Кахно), агульнага і славянскага мовазнаўства (загадчык прафесар А. Я. Супрун), замежнай літаратуры (загадчык дацэнт І. В. Шаблоўская).

Вучэбна-выхаваўчы працэс вядуць тыя ж выкладчыкі, якія працуюць на стацыянары і вячэрнім аддзяленні. Яны дапамагаюць студэнтам-завочнікам набыць устойлівыя і трывалыя веды па вывучаемых прадметах, авалодаць методыкай выкладання мовы і літаратуры, а таксама набыць навыкі самастойнай навукова-даследчай работы.

Студэнты - завочнікі вывучаюць тыя ж дысцыпліны вучэбнага плана і ў тым жа аб'ёме, што і студэнты стацыянара, толькі колькасць гадзін, адведзеных на іх вывучэнне, меншая. Гэта і зразумела, таму што вучэбны працэс на завочным факультэце адрозніваецца ад стацыянарнага тым, што ён дзеліцца на дзве вучэбна-экзаменацыйныя сесіі (зімовую і летнюю) і перыяд міжсесійнай самастойнай работы студэнтаў.

Значнае месца ў вучэбным плане студэнтаў - завочнікаў адводзіцца прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Таму яны павінны валодаць глыбокімі ведамі па сучаснай беларускай і рускай мовах, гісторыі беларускай і рускай літаратур, методыцы іх выкладання, старaславянскай мове, культуры мовы, рускай і беларускай дыялекталогіі, фальклору, тэорыі літаратуры, агульнаму мовазнаўству і інш.

Вялікае значэнне надаецца на факультэце вывучэнню грамадскіх дысцыплін, якія фарміруюць у студэнта марксісцка-ленінскі светапогляд і выхоўваюць актыўную жыццёвую пазіцыю. Гэта такія дысцыпліны, як гісторыя КПСС, навуковы камунізм, гісторыя СССР і БССР, марксісцка - ленінская філасофія і г. д. Акрамя гэтага, студэнты вывучаюць лацінскую мову, а таксама адну з замежных (англійскую, нямецкую, іспанскую ці французскую), літаратуру народаў СССР і замежную літаратуру (літаратуру краін Еўропы, Азіі і Амерыкі), шэраг дысцыплін па спецыялізацыі, праходзяць вучэбна - педагагічную практыку.

Студэнтам-завочнікам чытаюцца лекцыі, праводзяцца практычныя і семінарскія заняткі. Вучонымі факультэта напісана шмат падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак для студэнтаў-завочнікаў.

Выкладчыкі даюць рэкамендацыі, як лепш арганізаваць самастойнае вывучэнне матэрыялаў, як выканаць кантрольныя і курсавыя работы, як рыхтавацца да залікаў і экзаменаў.

Кожны месяц праводзяцца дні завочніка, у час якіх можна атрымаць кваліфікаваную кансультацыю, датэрмінова здаць залік ці экзамен, сустрэцца з кіраўніком курсавой ці дыпломнай работы.

Шматгадовая практыка сведчыць аб тым, што выхаванцы завочнай формы навучання з'яўляюцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі-філолагамі, якія з гонарам нясуць высокае званне настаўніка. Многія з выпускнікоў-завочнікаў сталі вядомымі вучонымі, дзеячамі культуры, пісьменнікамі.

## ЖУРНАЛІСТЫКА

ФАКУЛЬТЭТ журналістыкі быў створаны ў 1944 годзе ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва». Утварэнне факультэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны — яшчэ адно сведчанне клопатаў партыі пра наш друк. Факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна такім чынам з'явіўся родапачальнікам у падрыхтоўцы кадраў для друку ва універсітэтах нашай краіны.

На факультэце ёсць завочнае аддзяленне, якое рыхтуе работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды — газет, часопісаў, радыё і тэлебачання.

За час існавання факультэт падрыхтаваў па стацыянарнай, вячэрняй і завочнай формах навучання больш як 3000 высокакваліфікаваных журналістаў. Многія яго выпускнікі сталі вядомымі партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі работнікамі, грамадскімі дзеячамі, вучонымі. Сёння няма практычна ніводнага раёна, дзе б не працавалі нашы выпускнікі, а многія працуюць за межамі Беларусі. Факультэт закончыў старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР У. І. Бровікаў, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, кандыдат гістарычных навук С. Я. Паўлаў, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова. міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч, старшыня Дзяржкамітэта па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю М. М. Дзялец, старшыня Дзяржкіно БССР В. В. Мацвееў, старшыня Дзяржтэлерадыё БССР Г. М. Бураўкін. Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Філімонаў, загадчык карэспандэнцкага пункта «Известий» драматург М. Е. Матукоўскі. Амаль палова членаў Саюза пісьменнікаў БССР — выхаванцы факультэта журналістыкі. Сярод іх — сакратары Саюза пісьменнікаў БССР Іван Чыгрынаў, Барыс Сачанка, Васіль Зуёнак, а таксама паэты і пісьменнікі Мікола Аўрамчык, Іван Пташнікаў, Георгій Шыловіч, Уладзімір Паўлаў, Янка Сіпакоў і многія іншыя.

З кожным годам факультэт набірае сілу. Расце колькасць выкладчыкаў, павышаецца іх кваліфікацыя. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Асабліва гэта відавочна пасля пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў». Калі ў пяцідзесятых гадах на факультэце дзейнічала толькі адна кафедра, то зараз іх чатыры: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання. Кафедры ўзначальваюць прафесары і дацэнты. Сёння на факультэце працуе 37 выкладчыкаў, з іх 6 дактароў навук і 16 дацэнтаў. Сярод іх дактары навук Р. В. Булацкі, Е. Л. Бондарава, А. І. Наркевіч, І. І. Сачанка, Б. В. Стральцоў, М. Я. Цікоцкі, дацэнты Я. Р. Радкевіч, С. М. Грабчыкаў, Н. А. Сніцарава, С. В. Говін, Н. Ц. Фральцова, Л. Ф. Шылава, А. А. Плаўнік, Т. Д. Арлова, В. М. Шэін і іншыя. Імі выдадзена шмат манаграфій, кніг, брашур па гісторыі, тэорыі і практыцы журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання.

На факультэце ёсць радыё- і тэлестудыя, фоталабараторыя. У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС «Аб задачах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» на факультэце больш глыбока вывучаюцца грамадска-палітычныя, агульнаадукацыйныя і спецыяльныя дысцыпліны: тэорыя марксізма-ленінізму, гісторыя КПСС, унутраная і знешняя палітыка партыі і ўрада, савецкае права, тэорыя і практыка буржуазнай журналістыкі, метады ідэалагічнай работы, прыкладная сацыялогія. Па універсітэцкай праграме студэнты вывучаюць беларускую, рускую, замежную мову і літаратуру, практычную стылістыку і рэдагаванне, гісторыю рускай, партыйна-савецкай, замежнай камуністычнай і рабочай журналістыкі, тэорыю і практыку тэлебачання і радыёвяшчання, тэхніку газетнай справы, журналісцкае майстэрства.

Факультэт журналістыкі рыхтуе кадры не толькі для рэспублікі, але і для больш чым 40 краін, якія развіваюцца.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў па эканамічных пытаннях. Таму ўводзяцца новыя курсы па вывучэнню актуальных праблем сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнаму прагрэсу, аналізу гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, комплекснай праграме ідэйнага выхавання і інш. Студэнты факультэта выпускаюць сваю вучэбную газету «Журналіст» і альманах «Творчасць журналіста», актыўна ўдзельнічаюць у выпуску шматтыражкі «Беларускі універсітэт», працуюць у гуртках студэнцкага навуковага таварыства. Шмат цікавага даюць ім сустрэчы са старэйшымі калегамі па пяру, вучонымі, пісьменнікамі, артыстамі, рэжысёрамі.

## БІЯЛОГІЯ

БІЯЛАГІЧНЫ факультэт з'ўляецца старэйшым і буйнейшым цэнтрам у рэспубліцы па падрыхтоўцы біёлагаў. Па гэтай спецыяльнасці падрыхтоўка вядзецца на дзённым і завочным аддзяленнях. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «біёлаг, выкладчык біялогіі і хіміі».

Агульнанавуковая падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца пры дапамозе вывучэння цыкла грамадскіх дысцыплін, замежнай мовы, вышэйшай матэматыкі, фізікі, неарганічнай, арганічнай, аналітычнай, фізічнай і калоіднай хіміі, варыяцыйнай статыстыкі, Студэнты вывучаюць таксама педагогіку, псіхалогію, методыку выкладання біялогіі і хіміі, праходзяць педагагічную практыку ў сярэдняй школе.

Агульнапрафесійная падрыхтоўка пачынаецца з першага курса і забяспечваецца вывучэннем уводзін у спецыяльнасць, заалогіі беспазваночных і пазваночных, анатоміі, марфалогіі і сістэматыкі раслін, мікрабіялогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяхіміі, біяфізікі, гісталогіі, генетыкі. дарвінізму.

На гэтай аснове вядзецца спецыялізацыя студэнтаў, якая пачынаецца з III курса на дзённай і з IV курса на завочнай формах навучання па адной з сучасных галін біялогіі: батаніцы, заалогіі. Студэнты праходзяць вытворчую практыку ў лабараторыях кафедраў, экспедыцыях, інстытутах Акадэміі навук БССР і іншых навуковых установах, на прамысловых прадпрыемствах.

На факультэце працуе сем кафедраў, комплексная праблемная лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, лабараторыя фотасінтэзу (пры кафедры фізіялогіі раслін), біялагічная станцыя на возеры Нарач, вучэбна-доследная гаспадарка «Шчамысліца», батанічны сад. Вучэбны працэс забяспечваюць 28 вучэбных і навукова-даследчых лабараторый і кабінетаў.

Вучэбны працэс на факультэце вядуць 4 дактары і 40 кандыдатаў біялагічных навук, а таксама супрацоўнікі біялагічных інстытутаў Акадэміі навук БССР.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на работу ў якасці настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ВНУ, ва ўстановы сістэмы Дзяржаўнага камітэта па ахове прыроды, дзяржаўныя запаведнікі, на прамысловыя прадпрыемствы, а студэнты, якія выявілі здольнасці да навукова-даследчай работы, — ва ўстановы Акадэміі навук БССР, а таксама ў навукова - даследчыя інстытуты Міністэрства сельскай гаспадаркі, Міністэрства аховы здароўя.

# ФАКУЛЬТЭТ

## ГЕАГРАФІЯ

ГЕАГРАФІЧНЫ факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічная адукацыя ва універсітэце вызначаецца шырокім дыяпазонам ведаў, таму выпускнікоў факультэта можна сустрэць у школах, навукова-даследчых, праектных і вытворчых установах і арганізацыях прыродазнаўчага, эканамічнага і краязнаўчага профілю.

На факультэце тры аддзяленні: дзённае, вячэрняе і завочнае. У саставе факультэта сем кафедраў і дзве лабараторыі: праблемная навукова-даследчая лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая лабараторыя возеразнаўства.

Студэнты завочнага факультэта атрымліваюць спецыяльнасці: фізічная ці эканамічная геаграфія. Студэнты - завочнікі, таксама як і студэнты дзённага і вячэрняга аддзяленняў, вывучаюць грамадскія і агульнаадукацыйныя дысцыпліны, шырокае кола геаграфічных навук. Усе студэнты слухаюць лекцыі па агульнай геалогіі, глебазнаўству і геаграфіі глеб, метэаралогіі і кліматалогіі, гідралогіі, біягеаграфіі, геадэзіі і картаграфіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі замежных краін, агульнай тапаніміцы, геаграфіі БССР, гісторыі і металогіі геаграфічнай навукі і іншыя.

Акрамя таго, фізіка-географы вывучаюць геахімію і геафізіку ландшафтаў, фізіка-геаграфічнае раяніраванне і карціраванне, агракліматалогію і іншыя спецыяльныя дысцыпліны. У ліку спецкурсаў, якія чытаюць для эканоміка-географаў, — эканамічная геаграфія, асновы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, эканамічнае раяніраванне, статыстыка, раённая планіроўка.

Важным відам вучэбнай дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў з'яўляюцца вучэбныя і вытворчыя практыкі. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў факультэта створана вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна» — месца праходжання ўсіх відаў вучэбнай практыкі. Тут ёсць тры корпусы інтэрнатаў, вучэбныя пакоі, клуб, сталовая, спартыўная пляцоўка, лабараторыі. У час вучэбных практык студэнты праводзяць тапаграфічныя здымкі мясцовасці, вывучаюць геалагічныя працэсы, глебу, вызначаюць форму і памеры ўзвышшаў, нізін, іх прыроду, вядуць назіранні за прыродай.

Заключным этапам з'яўляецца геаграфічная практыка. Вытворчая практыка студэнтаў-завочнікаў звязваецца, як правіла, з месцам і характарам іх работы. Па матэрыялах вытворчай практыкі пішуцца курсавыя і дыпломныя работы.

Як і студэнты дзённай формы навучання, завочнікі прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, падаюць работы на рэспубліканскі агляд-конкурс.

## ПРАВАЗНАЎСТВА

ПАДРЫХТОЎКА спецыялістаў-правазнаўцаў ажыццяўляецца па трох напрамках: дзяржаўна-прававому, гаспадарча-прававому і судзебна-пракурорска-следчаму.

Выпускнікі аддзялення працуюць у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, у міністэрствах, ведамствах, вытворчых аб'яднаннях, на прадпрыемствах, ва ўстановах, у органах юстыцыі, пракуратуры, міліцыі.

Дзяржаўна-прававая. Гэта спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў апаратах міністэрстваў, ведамстваў, іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання.

Гаспадарча-прававая. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі працуюць юрыстамі ў народнай гаспадарцы ў якасці начальнікаў аддзелаў міністэрстваў і ведамстваў, вытворчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, установ і арганізацый, а таксама юрысконсультамі.

Судзебна - пракурорска - следчая. Па гэтай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў, следчых, адвакатаў, натарыусаў, работнікаў апарату абласных аддзелаў юстыцыі, органаў Міністэрства ўнутраных спраў.

. Лепшыя студэнты — выпускнікі факультэта — маюць магчымасць паступіць у аспірантуру. Значная частка прафесарска - выкладчыцкага саставу факультэта — былыя выпускнікі.

Вучоныя факультэта прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы многіх законаў Беларускай ССР. Яны былі ўключаны ў рабочыя групы па падрыхтоўцы крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянскага, грамадзянска - працэсуальнага, працоўнага і іншых кодэксаў. Да навукова-даследчай работы па падрыхтоўцы праектаў заканадаўчых актаў прыцягваюцца студэнты. У іх ёсць магчымасць працаваць і па тэарэтычных праблемах дзяржавы і права.

На кафедрах факультэта працуюць навуковыя студэнцкія гурткі.

У працэсе вучобы студэнты праходзяць і вытворчую практыку ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца вучоба абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

У сувязі з тым, што работа следчага, суддзі, пракурора, адваката патрабуе не толькі юрыдычных ведаў, але і практычнага жыццёвага вопыту, правіламі прыёму на юрыдычны факультэт устаноўлены некаторыя перавагі для асоб, якія маюць стаж работы не менш як 2 гады або праслужылі ва Узброеных Сілах СССР.

## ГІСТОРЫЯ

ГІСТАРЫЧНЫ факультэт быў адкрыты ў верасні 1934 года. На факультэце тры аддзяленні: дзённае, вячэрняе і завочнае. На ўсіх формах навучання рыхтуюць спецыялістаў-гісторыкаў: настаўнікаў, выкладчыкаў тэхнікумаў, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і ВНУ, навуковых работнікаў. Выпускнікі аддзялення працуюць у партыйных і камсамольскіх органах, музеях, экскурсбюро і іншых установах.

Студэнт-завочнік атрымлівае шырокую гуманітарную адукацыю і глыбокую ідэйна-тэарэтычную падрыхтоўку, а таксама фундаментальныя веды па сацыяльных дысцыплінах.

На факультэце працуюць вядомыя вучоныя, дактары навук, прафесары. Сярод іх доктар гістарычных навук, прафесар І. В. Царук, доктар гістарычных навук, прафесар, Герой Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, Герой Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў, дактары гістарычных навук, прафесары І. В. Аржахоўскі, У. К. Коршук, Л. М. Шнеерсон, Р. М. Трухноў, В. В. Чапко, Д. Б. Мельцар, доктар філасофскіх навук прафесар В. С. Сцёпін, доктар філасофскіх навук, прафесар А. С. Кляўчэня, член-карэспандэнт АН БССР П. Т. Патрыкаў, акадэмік АН БССР І. М. Ігнаценка. Большасць з іх з'яўляюцца выхаванцамі факультэта.

Многія былыя студэнты ўсіх аддзяленняў займаюць зараз высокія і адказныя пасады. Сярод іх — сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, міністры М. М. Мяшкоў і М. Г. Мінкевіч, вядомы савецкі дыпламат П. А. Абрасімаў. Ёсць сярод выпускнікоў дырэктары НДІ, рэктары ВНУ, дэканы, загадчыкі кафедр грамадскіх навук, адказныя работнікі партыйнага і савецкага апарату.

Студэнты-гісторыкі маюць магчымасць спецыялізавацца па гісторыі СССР, гісторыі БССР, гісторыі КПСС, новай і навейшай гісторыі, гісторыі рэлігіі і атэізму, археалогіі і этнаграфіі, савецкаму праву.

Кафедры факультэта аказваюць дапамогу настаўнікам сярэдніх школ рэспублікі ў паляпшэнні выкладання гісторыі, выдаюць дапаможнікі і метадычныя распрацоўкі для школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

На факультэце ёсць музей, які складаецца з аддзелаў археалогіі, этнаграфіі, старажытнага Усходу, антычнага мастацтва, нумізматыкі і манетных кладаў. У 1977 годзе створаны музей універсітэта.

Факультэт падтрымлівае трывалыя сувязі з Сафійскім (НРБ) і Йенскім (ГДР) універсітэтамі. Кожны год студэнты факультэта праходзяць практыку ў ГДР, знаёмяцца з гісторыяй і культурай гэтай братняй краіны. У сваю чаргу студэнты з Балгарыі, ГДР, Польшчы — частыя госці на факультэце.

## БЫЦЬ ПЕРШЫМ— ГАНАРОВА

НЕКАЛЬКІ гадоў запар біялагічны факультэт займае першыя месцы па навукова-даследчай рабоце студэнтаў. Нядаўна былі падведзены вынікі чарговага рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ за 1983 год. У мінулым годзе на конкурс падалі работы студэнтаў восем кафедраў факультэта. Усе 13 работ былі ацэнены журы вышэйшай адзнакай — аднесены да першай катэгорыі. Аўтары сямі навуковых работ адзначаны спецыяльнымі прэміямі.

Дзве навуковыя работы выкананы студэнтамі завочнага факультэта і адна — вячэрняга аддзялення. Гэта яшчэ раз абвяргае думку, што студэнты гэтых форм навучання мала ўдзельнічаюць у навуковых даследаваннях у сувязі з дэфіцытам часу.

Па выніках конкурсу спецыяльнымі прэміямі МінВНУ БССР узнагароджаны студэнты М. Максіменкаў, Т. Кушнер, Л. Ластоўская і Т. Федарэнка. Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР адзначыла прэміямі работы У. Шэўчыка, Н. Анохінай і Л. Ерашэнкавай. Першай прэміяй Беларускага рэспубліканскага савета адзначаны работы Н. Казуб і А. Завадскай.

Не маючы магчымасці удзяліць увагу ўсім лаўрэатам конкурсу, хочацца расказаць аб некаторых з іх.

Алена Завадская пісала сваю работу на кафедры экалогіі і прысвяціла яе важнаму і складанаму кампаненту водных экалагічных сістэм — перыфітоннаму згуртаванню, якое адыгрывае значную ролю ў самаачышчэнні вадаёмаў. Перыфітонныя згуртаванні з'яўляюцца добрым індыкатарам санітарнага стану вады. У Беларусі гэта першая работа, прысвечаная данай тэме. Неабходныя даныя Алена атрымала пасля аналізу проб азёраў Нарач і Мястра.

Работа Наталлі Анохінай прысвечана актуальнаму пытанню сучаснай генетыкі — вывучэнню ўздзеяння навакольнага асяроддзя на праяўленне гаспадарча-каштоўных якасцей раслін.

Таццяна Кушнер працуе над тэмай, звязанай з энергазабеспячэннем і дыханнем клетак. Рэзультаты яе работы, магчыма, дапамогуць зразумець механізм такіх цяжкіх захворванняў, як спазм сасудаў галаўнога мозгу, бранхіяльная астма, эпілепсія, парушэнне сардэчна-сасудзістай дзейнасці. Нядаўна стала вядома, што Таццяна атрымала тры аўтарскія пасведчанні на вынаходствы.

Патрэбна адзначыць, што ўсе работы, пададзеныя на конкурс, напісаны на высокім навуковым узроўні. Такой думкі былі рэцэнзенты і журы.

**М. МАГІЛЕЎСКАЯ,**
**студэнтка біялагічнага факультэта.**

## ВЫПРАЦОЎВАЕЦЦА САМАСТОЙНАСЦЬ

ПЕРШЫ РАЗ на заняткі ў клас ЭВНС прыйшлі на другім курсе. Мы мала ведалі аб гэтым класе. Старшакурснікі гаварылі, што тут — цікава.

Перад намі стаялі складаныя машыны, крыху боязна было садзіцца за іх. Нямногія з нашай групы з першай спробы рашылі задачы, і машына «выстаўляла» здавальняючыя і нездавальняючыя адзнакі. Але мы рашылі даказаць, перш за ўсё сабе, што можам добра спраўляцца з заданнем. На гэтых занятках затрымаліся доўга, але прымусілі машыну выставіць «добра» і «выдатна».

Занятк. ў класе ЭВНС праходзяць на другім і трэцім курсах. Гадзін адпушчана не вельмі многа, але эфектыўнасць — вялікая.

Калі на першых занятках я зрабіла шмат памылак, то на наступных заўсёды спраўлялася з заданнем. У кожнай групе ёсць моцныя студэнты, ёсць крыху слабейшыя. І да кожнага патрэбны дыферэнцыраваны падыход. У класе студэнт застаецца сам-насам з машынай. Заданні даюцца паступова — ад лёгкіх да цяжэйшых. Студэнты самі праходзяць шлях ад пачатку рашэння і да канчатковага выніку. Колькасць задач, якія мы паспяваем рашыць за дзве акадэмічныя гадзіны, значна большая, чым пры звычайных занятках.

Часта бывае так, што мы спадзяёмся на прыхільнасць выкладчыка, на яго завышаныя адзнакі, тут жа такога няма. Даводзіцца працаваць самастойна. Гэта адбіваецца і на паспяховасці.

**А. ГАВІНА,**
**студэнтка хімічнага факультэта**



Давер'е. Фотаэцюд А. Валошына.

# ГАВОРАЦЬ, ШТО...

● У 1983 годзе група «Пінк Флойд» запісала новы альбом пад назвай «Апошні этап», прысвечаны праблемам вайны і міру. Музыка яго вельмі падобна да ўжо вядомага альбома «Сцяна» (1979 г.).

● НЯДАЎНА закончыўся 34 фестываль песні ў італьянскім горадзе Сан-Рэмо. Першае месца на ім падзялілі дуэт Албано і Раміно Падэр, вядомы савецкім слухачам па песні «Фелічыта» («Шчасце»), якія выканалі на фестывалі песню «Будзе», і спявак і кампазітар Тота Кутунья, які выступіў з песняй «Серэнада».

● АДНЫМ з самых папулярных прадстаўнікоў польскай эстрады з'яўляецца Франэк Кімоно. Яго песні «Кінг Брус Лі—каратэіст», «Пола Манола», «Ола і Лола» моцна трымаюцца ў дзесятцы лепшых.

● АЛА ПУГАЧОВА запрошана ўдзельнікамі групы «Абба» здымацца ў новай рок-оперы «Шахматы». Некаторыя сцэны оперы мяркуюць зняць у Маскве.

● РОБІН Джыб, адзін з братоў Джыбаў, якія складаюць аснову ансамбля «Бі Джыз», атрымаў месца генеральнага дырэктара музычных праграм Галівуда. «Бі Джыз» такім чынам ператварыліся ва ўсеамерыканскую фірму па вытворчасці музыкі. Гульня ў грошы працягваецца.

● Групу «Машына часу» пакінулі піяніст Пётр Падгарадзецкі і менеджэр Мелік Пашаеў. Зараз яны працуюць у другім папулярным маскоўскім ансамблі «Нядзеля».

● У ЧАС аднаго з рэкламных шоу з вядомым выканаўцам дыска-музыкі Майклам Джэксанам адбылася вялікая непрыемнасць. З-за няспраўнасці асвятляльнай сістэмы пачаўся пажар, у выніку якога кумір дыскатэк атрымаў некалькі сур'ёзных апёкаў і спаліў валасы. Майкл, дарэчы, нядаўна вырашыў расстацца са сваім амплуа сольнага спевака і вярнуцца ў групу «Зэ Джэксан Файв». Зараз браты Джэксаны працуюць над новым альбомам.




# СЮРПРЫЗ ГРУПЫ СТАСА НАМІНА

АМАТАРЫ музыкі, напэўна, яшчэ памятаюць той незвычайны поспех, які выпаў на долю пласцінкі «Гімн сонцу», запісанай групай Стаса Наміна ў 1980 годзе.

Пасля гэтага аб групе нічога не было чуваць. Часта мяняўся састаў, не вельмі прыемнымі былі і водгукі крытыкі аб іх творах. І вось перад намі іх новая работа — дыск «Сюрпрыз для мсье Леграна».

Жаданне вядомага французскага кампазітара Мішэля Леграна паслухаць свае песні ў выкананні групы Стаса Наміна не выпадковае (таксама як не выпадковы і энтузіязм, з якім была прынята прапанова ансамблем). Гэты калектыў з'яўляецца вельмі блізкім кампазітару па лірычнаму накіраванню ў сучаснай музыцы. Легран часта бывае ў нашай краіне, добра знаёмы з творчасцю многіх савецкіх выканаўцаў.

На фестывалі «Мідэм-81» у Канах, дзе быў паказаны ўрывак будучай пласцінкі групы, водгукі крытыкі былі адзінымі: «Калі б фільм «Шэрбургскія парасоны» здымалі зараз, лепшага выканання Леграна наўрад ці можна было б чакаць. Галоўнае тут, падкрэслівалася далей,— беражлівыя адносіны музыкантаў да аўтарскіх інтанацый, увогуле да французскай песні, традыцыйна лірычнай».

Інтэрпрэтацыі вядомых усяму свету песень Леграна ў выкананні групы Стаса Наміна з'явіліся настолькі незвычайнымі, свежымі і сучаснымі, што гэтая работа савецкіх музыкантаў — своеасаблівы сюрпрыз для многіх аматараў музыкі і перш за ўсё для самога кампазітара.

# «АРКЕСТРОВЫЯ МАНЕЎРЫ Ў ЦЕМРЫ»,

## АБО «МАЛЮНКІ» СА СТУДЭНЦКАЙ ДЫСКАТЭКІ З КАМЕНТАРЫЯМІ

ЛЮБЫ «бывалы» студэнт ведае, што дыскатэка — гэта сучасныя танцы. Кожную суботу ў інтэрнатах адбываюцца міграцыі, незразумелыя для чужога вока, але для «абарыгенаў» — добра вядомыя. Адна невялічкая кампанія сустракае на лесвічнай пляцоўцы другую, і паміж імі адбываецца дыялог. «Ну, як там наверсе, штонебудзь чуваць?» — гучыць як пароль. У залежнасці ад адказу групы або вяртаюцца назад, або з яшчэ большай энергіяй працягваюць узыходжанне. Дык што ж павінна быць «наверсе» і чаго так чакаюць у гэты суботні вечар жыхары інтэрната? Чакаюць дыскатэкі. Паступова студэнцкі паток на лесвіцы гусцее, прама прапарцыянальна яму павялічваецца «напружанне абстаноўкі».

І вось калі провады чарговага працоўнага тыдня закончаны, посуд прыбраны ў шафу, самых «змарнелых» паклалі спаць, а больш моцныя ўзнімаюць свой баявы дух шпацыраваннем па калідорах, калі ногі самі просяцца ў скокі, а вусны напяваюць мелодыю чарговага баевіка групы «Сікрэт Сервіс» і, здаецца, яшчэ некалькі хвілін, і танцы пачнуцца стыхійна, за справу бяруцца «прафесіяналы». У адной з чытальных залаў поўнасцю адключаюцца ўсе асвятляльныя прылады, і ў самых інтымных абставінах пачынаецца «таямніца яднання з музыкай».

А першай гадзіне ночы ніводзін куточак Мінска не можа спаборнічаць з «чыталкамі» па колькасці насельніцтва на адзін квадратны метр. Танцуюць проста: хуткія танцы — падскокваем, павольныя — штурхаемся.

Другая гадзіна ночы. Некага папрасілі выйсці. Ён пайшоў і больш не прыходзіў. Нехта выйшаў сам, але яго прывялі назад. Некаторыя яшчэ танцуюць, што называецца, «да перамогі», а дружныя воклічы «эбра-эбра-кадэбра» глушаць голас Сціва Мілера, які даносіцца з калонак.

Але паступова энтузіязм танцораў падае. У галаве — толькі абрыўкі тэкстаў песень, лейтматывам якіх з'яўляюцца словы: «Спыніце музыку!». Так праходзіць яшчэ дзве гадзіны, а потым, змораныя, усе разыходзяцца па пакоях, каб добра адпачыць перад новым працоўным тыднем. Як співаецца ў папулярнай песні: «И нет ни слов, ни музыки, ни сил». А да панядзелка засталося каля 17 гадзін...

Зразумела, уся гэта гісторыя крыху гіпербалізавана. Але давайце задумаемся, ці не ператварылі мы дыскатэку, тую самую, аб якой столькі пісалі і пішуць і на якую энтузіясты гэтай справы ўскладвалі вялікія надзеі,— у звычайныя «скачкі» і «дыскачы», як перахрысцілі дыскатэкі іх пастаянныя наведвальнікі. І ці заўсёды тыя, хто ходзіць на гэтыя мерапрыемствы, разумеюць, што дыскаклуб — гэта адно, а танцы пад магнітафон — зусім другое?

Успомніце, як многа гаварылі аб дыскапраграмах, прысвечаных рок-операм «Кароль Артур» Рыка Вейкмана і «Ісус Хрыстос — суперзорка» Вебера і Райта, якія абышлі дыскатэкі ўсёй краіны. А пастаўлены яны студэнтамі! Але ўжо тады паўстала пытанне аб паступовым ператварэнні дыскаклубаў у звычайныя танцы, толькі зробленыя на больш высокім тэхнічным узроўні. Ёсць і удалыя спалучэнні гэтых двух жанраў. І найбольш сучаснай у гэтых адносінах асабіста мы лічым тую, якая арганізоўваецца Брэсцкім паркам культуры і адпачынку. Тут ёсць чаму павучыцца: рэжысуры, падбору музыкі і нават манеры вядзення праграмы дыскжакеем Валерыем Сямёнавым.

І яшчэ, удзельнікі «дыскамарафонаў» па прыкладу апісаных у пачатку часта не думаюць аб тым, што ім прапаноўваюць для танцаў. А між тым, напрыклад, група «Назарэс» пад гукі развясёлага рок-н-рола заклікае: «Ты апрануты, каб забіваць». Ёсць над чым задумацца. А вось другі ўзор таго, як за моднай мелодыяй стаіць адкрытая парнаграфія. «Прыйдзі і задаволь мяне»,— спявае амерыканская група «Баррабас». Патрэбна дадаць, што без гэтай песні не абыходзіцца ніводная дыскатэка ў інтэрнаце. І сустракаецца яна заўсёды... цёпла. Тэмай «лёгкага кахання» пранікнута і большасць песень папулярнага трыо «Арабескі». «Я не хачу піць чай з табою раніцай. Усё наша каханне цудоўна толькі на адну ноч»,— спяваюць яны. Тут, як гаворыцца, каментарыі не патрэбны.

Многія, зразумела, могуць запярэчыць, што на дыскатэцы працуюць ногі, а не галава. І таму нікому няма справы да таго, хто што спявае на незразумелай для большасці мове. Сапраўды, аб гэтым павінны думаць не толькі тыя, хто ідзе на танцы, а і тыя, хто іх арганізуе. Тым больш, што разам з савецкімі студэнтамі ў інтэрнатах жывуць сотні замежных. А яны, як паказвае вопыт, у пытаннях, якія датычаць таго, што прапагандуе тая ці іншая песня, аказваюцца куды больш адукаванымі. І якія вывады робяць яны, убачыўшы такую прапаганду буржуазнага ладу жыцця? Над гэтым таксама патрэбна задумацца.

Аднак не патрэбна параўноўваць магчымасці (ды і патрабаванні) клубных дыскатэк і тых, што адбываюцца кожную суботу ў інтэрнатах. Тут студэнты праводзяць дыскатэкі па ўласнай ініцыятыве і на ўласнай апаратуры. І галоўная задача тут — «пратрымацца да раніцы» (хоць і даецца гэта вельмі дарагой цаной — ломкай усіх прынцыпаў і правіл правядзення мерапрыемстваў такога тыпу). Але гэта адбываецца не таму, што арганізатары дыскатэкі не хочуць рабіць праграмы больш высокага ідэйнага і арганізацыйнага ўзроўню. Цяжка зрабіць гэта, калі многага не хапае, і перш за ўсё — ведаў, густу.

Як дапамагчы дыскатэцы, якая ператварылася ў «аркестровыя манеўры ў цемры», выйсці з наезджанай каляіны — гэтае пытанне важнае. Тым больш, што на дыскатэку, хай і такую, якая яна ёсць, усё ж ідуць. Чакаюць яе, як і гэтай суботы, цэлы тыдзень...

Матэрыялы «Камертона» падрыхтавалі студэнты факультэта журналістыкі Аляксандр ЛІПСКІ і Вацлаў БАГДАНОВІЧ.

# ● ДВАЦЦАТАЯ КАЛОНКА

## Вучыцца ніколі не позна

У ЛОНДАНЕ мяркуецца адкрыць універсітэт для пенсіянераў, якія ў юнацкія гады былі вымушаны рана прыпыніць сваю адукацыю. Большасць англійскіх універсітэтаў і выкладчыкаў адобрылі гэты праект. Такі універсітэт ёсць ужо ў Францыі і карыстаецца вялікай папулярнасцю.

## Калі не хапае вытрымкі

АСНОЎНЫЯ рысы аматараў лонданскага таварыства прыхільнікаў мінулага — цярпенне і вытрымка. У клуб можа быць прыняты толькі той, хто катэгарычна адмаўляецца ад усіх зручнасцей сучаснай цывілізацыі — не ездзіць у аўтамабілях і паяздах, не лятае ў самалётах, не слухае радыё, не глядзіць тэлевізар, не фатаграфуецца і г. д. Парушальнікі гэтых забарон без жалю выключаюцца з суполкі. Так здарылася зусім нядаўна з двума членамі клуба — яны не здолелі ўтрымацца перад спакусай пагутарыць па тэлефоне.

## Крэсла для роздуму

ЦЭЛЫХ 15 гадоў працаваў японец Іашыра Накаматэу над канструкцыяй свайго крэсла з падлакотнікамі. На выстаўцы кур'ёзных вынаходстваў у Токіо ён атрымаў за сваё крэсла першую прэмію. Яно мае падстаўку для ног, якая абаграваецца інфрачырвонымі промнямі. На высокай спінцы зверху знаходзіцца падушка для галавы, якая абпраменьваецца мікрахвалямі. Абслугоўваючы кліента зверху і знізу, крэсла ажыўляе мысленне дзякуючы лепшаму забеспячэнню мозгу.

Ва універсітэце Цукуба студэнты, якія знаходзіліся ў крэсле дзесяць хвілін, складвалі і перамнажалі лічбы лепш за сваіх сяброў.

## Энцыклапедыя рыжых

ЧЛЕНЫ лігі рыжых з французскага горада Перпіньяна выканалі тытанічную працу па збору і сістэматызацыі ўсяго, што адносіцца да людзей з рыжымі валасамі. На іх думку, рыжымі былі Алена Прыгожая і Клеапатра. Зараз такія людзі сустракаюцца на ўсёй планеце, аднак пальму першынства трымаюць шатландцы, валійцы і ірландцы. Згодна з даследаваннямі, вогненная пігментацыя валасоў часцей за ўсё перадаецца па спадчыне. Адзначана, што ўладальнікі яе больш запальчывыя. Затое сярод іх амаль не сустракаюцца аблыселыя.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

12 красавіка 1984 г.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 320221 Зак. 639

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ